Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 240 (309)
СЕРАДА
16
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАДРЫХТАВАНА СУСТРЭЦЬ ЗІМУ

Набліжаецца зіма. Прадпрыемствы нашай вобласці рыхтуюцца да работы ў зімовых умовах. Кіраўнікам прадпрыемстваў павінны быць памятны ўрокі мінулай зімы, калі фабрыкі і заводы рэзка знізілі выпрацоўку з-за непадрыхтаванасці да нармальнай работы ў зімовыя месяцы. Толькі тады, калі наступілі лютыя марозы, кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў зразумелі, што значыць своечасова падрыхтавацца да зімы,- загатовіць і вывезці паліва, адрамантаваць вытворчыя корпусы і т. д.

Дорага каштавала тым прадпрыемствам, кіраўнікі якіх не паклапаціліся забяспечыць бесперабойную работу свайго прадпрыемства зімою. Мінулагоднія памылкі не павінны паўтарыцца.

Большэвіку-гаспадарніку вядома, што кіраваць — гэта значыць прадбачыць, своечасова і ўзорна падрыхтаваць прадпрыемства, якім яму даверана кіраваць, так, каб бесперабойна ішла работа ў зімовы час. Да зімы асталося мала часу. Гэты час трэба скарыстаць для падрыхтоўкі да зімы.

Прадпрыемствы Беластока і вобласці працуюць на мясцовым паліве. Здавалася-б, што кіруючыя работнікі прамысловасці праявяць большэвіцкую стараннасць, скарыстаюць кожную гадзіну спрыяючага надвор'я для загатоўкі і вывазкі дроў і торфу. На справе-ж далёка не так. Прадпрыемствы тэкстыльнага трэста забяспечаны палівам не больш як на месяц. З 272 тысяч кубаметраў дроў, адпушчаных трэсту, атрымана толькі 169 тысяч кубаметраў. Ад галоўлесааховы трэсту трэба атрымаць 116 тысяч кубаметраў дроў, атрымана толькі 10 тысяч. Тэкстыльны трэст павінен быў загатовіць 50 тысяч кубаметраў дроў, загатоўлена 40 тысяч, а вывезена толькі 10 тысяч кубаметраў. Між тым, такое пагражаючае становішча з загатоўкай і вывазкай паліва не выклікае асаблівай трывогі ў кіраўнікоў трэста.

План здабычы торфу па трэсту не выканан. Загатоўлена 25.388 тон — 68,6 процанта да плана. Колькасць загатоўленага торфу можа замяніць 50. тысяч кубаметраў дроў. Прадпрыемствы-ж да гэтага часу не падрыхтаваны да пераходу на апальванне торфам.

Зусім нездавальняюча ствараецца запас паліва на 8-м Васількоўскім камбінаце. Загатоўленыя дровы і торф ёсць, але вывазка не арганізавана. Кожнаму кіраўніку прадпрыемства павінна быць вядома, што важна не толькі загатовіць паліва. Тады толькі можна сказаць, што паліва ёсць, калі яно будзе вывезена на склады. А вывезці зараз дровы і торф куды лягчэй, чым позняй восенню або зімой.

Дрэнна рыхтуецца да зімы Ломжынскі завод сельскагаспадарчых машын. Тут работы непачаты край. Дырэкцыя завода заключыла дагавор з будаўнічай канторай на рамонт. Але рамонт ідзе надзвычайна марудна. Рамонтныя работы выканаш не больш чым на 5 процантаў. На заводзе будуецца новы механічна-зборачны цэх. Тэрміны сканчэння будаўніцтва праходзяць, а цэх далёка яшчэ не гатоў. Да ацяплення цэхаў на заводзе не прыступілі. У цэхах патрэбны печы, але іх не робяць. Не лепшае становішча з загатоўкай і вывазкай паліва. Вывезена толькі адзін вагон дроў, у той час як заводу патрэбна дзесяць вагонаў. Загатоўлена 224 тоны торфу, аднак яшчэ ні адна тона не вывезена.

Кіраўнікі некаторых прадпрыемстваў падрыхтоўку да зімы не адкладвалі на познюю восень, а рыхтаваліся загадзя. Так, напрыклад, паступілі на гродненскай табачнай фабрыцы. Тут яшчэ з вясны пачалі падрыхтоўку да зімы. Дырэкцыя паклапацілася аб тым, каб своечасова загатовіць і вывезці дастатковую колькасць паліва для прадпрыемства і рабочых.

На фабрыцы створан двухгадовы запас паліва. Акрамя гэтага, загатоўлена яшчэ 2.200 кубаметраў дроў, з якіх 900 кубаметраў ужо вывезена на склады. Адну тысячу кубаметраў дроў загатовілі для рабочых. Памяшканні фабрыкі таксама да зімы гатовы. Устаноўлены падвойныя аконныя рамы, адрамантавана вадаправодная сетка, прыведзена ў належны парадак кацельнае аддзяленне. На фабрыцы створаны ўсе ўмовы для прадукцыйнай і бесперабойнай работы ў зімовы перыяд.

У сувязі з падрыхтоўкай да зімы вялікая і адказная задача ўскладаецца на аддзелы галоўных механікаў прадпрыемстваў. Яны ў першую чаргу абавязаны звярнуць асаблівую ўвагу на становішча парасілавых установак і прывесці іх ва ўзорны парадак. Бо толькі пасапраўднаму падрыхтаваўшы парасілавыя ўстаноўкі, можна гаварыць аб эканоміі паліва, аб рацыянальным скарыстанні цеплыні. Неабходна праверыць параправоды з тым, каб маючыяся дэфекты неадкладна ліквідаваць.

Трэба таксама прывесці ў належны парадак апальваючую сістэму, дзверы і вокны, адрамантаваць дахі корпусаў. Аднак на некаторых прадпрыемствах з гэтай справай не спяшаюцца. Узяць 5-ы камбінат. Тут даўно пачалі рамонт дахаў вытворчых памяшканняў, але рамонт ідзе надзвычайна марудна.

Падрыхтоўка прадпрыемстваў да зімы — гэта справа не толькі адных гаспадарнікаў. Ім павінны аказаць дапамогу партыйныя і профсаюзныя арганізацыі. Задача кіраўнікоў прадпрыемстваў — поўнаўладных камандзіраў вытворчасці — штодзённа дабівацца далейшага павышэння прадукцыйнасці працы, высокай якасці выпускаемай прадукцыі. Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня для гэтага стварылі спрыяльныя ўмовы.

Арганізавана сустрэць зіму, стварыць усе ўмовы для няўхільнага росту выпрацоўкі прадукцыі — баявая і неадкладная задача кожнага кіраўніка прадпрыемства.

Аб'едналы пленум абкома і гаркома КП(б)Б

14 кастрычніка адбыўся аб'едналы пленум Беластоцкага абласнога і гарадскога камітэтаў КП(б)Б. На пленуме заслухан даклад тав. Ігаева аб рабоце абкома за перыяд пасля абласной партыйнай канферэнцыі. У спрэчках выступілі начальнік палітаддзела Беластоцкай чыгункі тав. Волкаў, сакратар Заблудаўскага райкома партыі тав. Марголін, сакратар Беластоцкага райкома тав. Анціпенка, сакратар Лапскага райкома тав. Садоўскі і іншыя.

На пленуме выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Малін.

Па дакладу прынята адпаведнае рашэнне.

Аб'едналы пленум разгледзеў таксама арганізацыйныя пытанні.

У сувязі з водпускам тав. С. С. Ігаева на вучобу, пленум вызваліў яго ад абавязкаў першага сакратара абкома. З прычыны ўходу на вучобу, тав. П. С. Спасаў вызвален ад абавязкаў сакратара абкома па кадрах.

У сувязі з тым, што тав. Тупіцын М. Н. выбран першым сакратаром Брэсцкага абкома КП(б)Б, ён вызвален ад абавязкаў сакратара Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Першым сакратаром Беластоцкага абкома КП(б)Б і гаркома КП(б)Б выбран тав. Н. В. Кісялёў. Сакратаром абкома па кадрах выбран тав. А. А. Кільбін. Другім сакратаром Беластоцкага гаркома КП(б)Б выбран тав. В. Р. Раманаў.

У састаў бюро абкома КП(б)Б давыбраны тт. Н. В. Кісялёў, С. С. Бельчанка, А. А. Кільбін, В. Р. Раманаў і Д. Г. Дуброўскі.

Паведамленне ТАСС

Агенцтва Рэйтэр распаўсюджвае паведамленне англійскай газеты «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост», што нібыта ў цяперашні час адбываюцца перагаворы паміж Англіяй, Турцыяй, Совецкім Саюзам, Югаславіяй і Грэцыяй па пытанню аб прасоўванні Германіі на Ўсход.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэтае паведамленне не адпавядае сапраўднасці і з'яўляецца фантастычнай выдумкай «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост».

Працоўныя Беластоцкай вобласці адказваюць на пачатак выбарчай кампаніі новым палітычным і вытворчым энтузіязмам

Працоўныя Гродна рыхтуюцца да выбараў

ГРОДНА. (Па тэлефону). У гарадскім камітэце КП(б)Б адбылася нарада сакратароў партарганізацый і профсаюзнага актыва па пытанню аб пачатку выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. На нарадзе прысутнічала каля 60 чалавек. Пасля даклада старшыні горвыканкома тав. Ратайка нарада наметіла рад практычных мерапрыемстваў па разгортванню масавай работы сярод выбаршчыкаў. Нарада наметіла таксама арганізацыйныя мерапрыемствы па правядзенню выбарчай кампаніі.

На буйнейшых заводах горада адбыліся шматлюдныя мітынгі.

На веласіпедным заводзе, дзе прысутнічала на мітынгу 170 чалавек, выступіў слесар тав. Александровіч, які ўказаў на тое, што пачатак выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы супадае з XXIII гадавінай Кастрычніцкай рэволюцыі. Гэты знамянальны дзень гродненскія рабочыя сустракаюць шырокаразгорнутым соцспаборніцтвам. У прынятай рэзалюцыі рабочыя завода абавязаліся выканаць план за кастрычнік—лістапад да 6 лістапада.

Мітынгі адбыліся на табачнай фабрыцы, дзе прысутнічала 650 рабочых і работніц і на 5-ым скурзаводзе.

М. Шахрай.

НА ДРУГІМ КАМБІНАЦЕ

Калі загудзеў гудок, рабочыя 2-га тэкстыльнага камбіната высыпалі з цэхаў. Усе накіроўваліся на мітынг, прысвечаны Ўказу Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных.

Лаўкі ўсе заняты. Чуваць галосная гутарка. Бадзёры настрой. Цішыня запанавала на двары камбіната, калі сакратар партарганізацыі тав. Дзянісава адкрыла мітынг. Слова прадастаўляецца прадстаўніку гарадского камітэта партыі тав. Рольніку.

Затым пачаліся выступленні. Адзін за другім гавораць рабочыя. Першым узяў слова стаханавец аддзелачнага цэха тав. Маславецкі. Ён гаворыць прачуленую прамову.

Раней у органы ўлады траплялі толькі багацеі, — кажа ён, — рабочы-ж не карыстаўся палітычнымі правамі.

Тав. Маславецкі заклікае сабраўшыхся працаваць высокапрадукцыйна, выпускаць добрую прадукцыю. Вокліч тав. Маславецкага ў чэсць комуністычнай партыі і роднага Сталіна тоне ў моры апладысментаў.

Слова бярэ ткач-двухстаночнік, стары кадравы рабочы тав. Вільчэўскі.

— Пачалася выбарчая кампанія, — гаворыць тав. Вільчэўскі. — Мы павінны прыняць у ёй самы актыўны ўдзел. Рабочыя добра памятаюць, як праходзілі выбары раней. Гэта-ж былі здзекі над працоўнымі. Напрыклад, калі выбіралі ў магістрат, збіралася кучка фабрыкантаў і сама рашала ўсе справы. Толькі цяпер сапраўды свабодныя выбары. За гэта мы дзякуем нашай партыі, совецкаму ўраду і вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну.

Гарачую прамову на польскай мове, якая была выслухана з вялікай увагай, гаворыць бракоўшчыца прадзільнага цэха тав. Муравецкая. Яна гаворыць аб вялікіх заваёвах народа, і ў прыватнасці працоўнай жанчыны, якая раней, да прыходу Чырвонай Арміі, фактычна была бяспраўнай. Совецкая ўлада дала жанчыне вялікія правы. Яна можа нароўні з мужчынам выбіраць і быць выбранай. Яна заклікае ўсіх рабочых прыняць актыўны ўдзел у выбарах, паказаць прыклад высокай свядомасці і арганізаванасці.

Мітынг, на якім прысутнічала 500 чалавек, прайшоў з вялікім уздымам. Рабочыя аднадушна прынялі рэзалюцыю, у якой абавязаліся працаваць толькі на «добра».

Выбярэм лепшых людзей

З радасцю сустрэлі рабочыя 29-ай беластоцкай фабрыкі Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. 14 кастрычніка пасля работы адбыўся мітынг.

Стары рабочы член фабкома тав. Розеншайн, адкрываючы мітынг, гаворыць:

— Усе мы памятаем магістрат, у які рознымі жульніцкімі махінацыямі выбіраліся нашы прыгнятальнікі. Колькі інтрыг было вакол выбараў, але рабочыя не хацелі ўдзельнічаць у выбарах. Гераічная Чырвоная Армія вызваліла нас ад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў і вызваліла нас ад ненавіснага магістрата.

— Цяпер мы будзем выбіраць свой горвыканком і свой аблвыканком.

— Мы выберам лепшых людзей, дастойных таварышоў, якія апраўдаюць наша давер'е і будуць аддана працаваць на карысць народа.

Пасля інфармацыі сакратара партарганізацыі тав. Стрыкава слова бярэ малады рабочы тав. Мілер.

— 15 снежня адбудуцца выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Мы выберам сваіх прадстаўнікоў у органы совецкай улады, якія будуць увасабляць нашы інтарэсы. А раней мы нават баяліся зайсці ў магістрат.

— Я ўпэўнен, што выбарчая кампанія пройдзе пры вялікай актыўнасці ўсіх працоўных. Мы павінны працаваць яшчэ больш прадукцыйна, павысіць якасць выпускаемай прадукцыі, змагацца з дэзарганізатарамі вытворчасці.

Страсна гаварыў выступіўшы на мітынгу стары кадравы рабочы тав. Смоляр.

— У панскай Польшчы выбары праходзілі з націскам з боку буржуазіі. А на выбары ў Советы мы ідзем з вялікай радасцю. Чаму? Таму што раней магістрат паразітам сядзеў на нашай шыі, таму, што ў ім засядалі эксплаататары, нашы ворагі. У горвыканком мы пашлём сваіх лепшых прадстаўнікоў, якія будуць працаваць на агульнае дабро.

У прынятай рэзалюцыі рабочыя горача вітаюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР і бяруць на сябе абавязацельства павысіць прадукцыйнасць працы, сустрэць дзень выбараў вытворчымі падарункамі.

З РЭЗАЛЮЦЫІ МІТЫНГА РАБОЧЫХ 13-ГА ТЭКСТЫЛЬНАГА КАМБІНАТА

Мы — рабочыя, работніцы, інжынерна-тэхнічныя работнікі 13-га тэкстыльнага камбіната — горача вітаем і адабраем Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР аб назначэнні выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных на 15 снежня 1940 года па абласцях Заходняй Беларусі.

Выбары ў мясцовыя органы совецкай улады пройдуць на аснове Сталінскай Канстытуцыі, праменнямі якой асветлен наш край, вызвалены год таму назад ад векавога гнёту памешчыкаў і капіталістаў.

У нашы мясцовыя органы совецкай улады мы выберам лепшых сыноў і дачок нашай вялікай радзімы.

У чэсць выбараў у мясцовыя органы совецкай улады заходніх абласцей Беларусі мы яшчэ лепш будзем працаваць на дабро нашай радзімы, дадзім больш тканіны высокай якасці, яшчэ больш павысім дысцыпліну і прадукцыйнасць працы, даб'ёмся датэрміновага выканання гадавой праграмы да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

ТАРЖАСТВО СОВЕЦКАГА ДЭМАКРАТЫЗМА

Совецкая Беларусь пасля з'яднання заходніх абласцей павялічылася па сваёй тэрыторыі і насельніцтву амаль у два разы і ператварылася ў дзяржаву з 10-мільённым насельніцтвам. Пакладзен канец расчляненню беларускага народа.

Народы заходніх абласцей з велізарным энтузіязмам узяліся за будаўніцтва новага жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

24 сакавіка 1940 года працоўныя заходніх абласцей Беларусі аднадушна аддалі свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У вярхоўныя органы дзяржаўнай улады СССР і БССР яны выбралі лепшых сыноў і дачок, адданых змагароў за справу Леніна—Сталіна, за справу комунізма. Выбары прайшлі з вялікім палітычным уздымам. З 2.930.628 выбаршчыкаў прынялі ўдзел у выбарах дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР 2.909.450 чалавек, што складае 99,27 процанта. За кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных галасавалі 2.850.406 выбаршчыкаў, або 97,97 процанта выбаршчыкаў, якія ўдзельнічалі ў выбарах.

Карысна напомніць, што на выбарах у польскі сейм у 1935 годзе па ўсёй Польшчы галасавала толькі 46 процантаў выбаршчыкаў, а ў некаторых раёнах прыняло ўдзел толькі 3 процанты. Сотні тысяч людзей байкатыравалі выбары ў польскія дзяржаўныя органы, выражаючы гэтым сваю нянавісць да ўлады памешчыкаў і капіталістаў.

Сваю любоў і адданасць справе комунізма, партыі Леніна—Сталіна працоўныя заходніх абласцей Беларусі прадэманстрыравалі на выбарах у Народнае Сабранне і Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Багаты вопыт мінулай выбарчай кампаніі будзе выкарыстан працоўнымі заходніх абласцей пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Прадстаіць вялікая работа. Будзе арганізавана 381 выбарчая акруга па выбарах у абласныя Советы, 4.286 выбарчых акруг па выбарах у раённыя Советы, 2.647 выбарчых акруг па выбарах у гарадскія Советы і 34.770 выбарчых акруг па выбарах у сельскія і пасялковыя Советы. У бліжэйшыя дні пачнецца вылучэнне лепшых, правераных людзей у выбарчыя камісіі. Усяго ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя выбарчыя камісіі павінна быць вылучана каля 185 тысяч чалавек. Часовыя упраўленні і члены выбарчых камісій павінны паклапаціцца аб падборы і абсталяванні памяшканняў для выбарчых участкаў, аб пільным складанні спіскаў выбаршчыкаў.

Працоўным заходніх абласцей Беларусі прадстаіць выбраць 42 тысячы дэпутатаў мясцовых Советаў. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты—адзін з самых адказных этапаў выбарчай кампаніі. Выключнае значэнне будзе мець перадвыбарчая агітацыя за кандыдатаў. Трэба неадкладна аднавіць гурткі, якія актыўна дзейнічалі ў час падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўныя Советы, прыцягнуць новыя тысячы агітатараў.

Працоўныя заходніх абласцей Беларусі сустракаюць выбарчую кампанію па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных ва ўмовах напружанай творчай дзейнасці. На нацыяналізіраваных фабрыках і заводах рабочыя, якія вызваліліся ад капіталістычнага прыгнёту, авалодваюць соцыялістычнымі метадамі працы, атрымліваюць вытворчыя перамогі. Зямля, аб якой вякамі марыла працоўнае сялянства, любоўна апрацоўваецца законным гаспадаром—сялянамі. Тысячы беззямельных і бескароўных сялян атрымалі зямлю, жывёлу і хлеб. У заходніх абласцях Беларусі ліквідавана беспрацоўе. Вялікія поспехі дасягнуты ў галіне культуры, народнай асветы і аховы здароўя.

Пад сцягам вялікай Сталінскай Канстытуцыі народы заходніх абласцей забяспечаць на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных новую, яшчэ больш магутную перамогу несакрушальнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Н. НАТАЛЕВІЧ,
Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР.

Мітынг у Крынках

КРЫНКІ, 15 кастрычніка. (Па тэлефону). Учора адбыўся тысячны мітынг працоўных горада, прысвечаны Ўказу Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі. Прысутныя з вялікай увагай выслухалі паведамлённе сакратара райкома партыі тав. Главіцкага аб Указе і аднадушна віталі пачатак выбарчай кампаніі.

На мітынгу выступіла 7 чалавек. 60-гадовы рабочы 6-га скурзавода тав. Іосім заявіў:

— Я памятаю, як эндэкі, бундаўцы ашуквалі нас. Нельга было па вуліцы прайсці, не аглядаючыся па баках. У кватэры кідалі камені, ламалі вокны і дзверы. Я прыношу глыбокую ўдзячнасць совецкаму ўраду, які пазбавіў нас ад прыгнятальнікаў. Мы арганізавана пойдзем на выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і аддадзім свае галасы за лепшых сыноў і дачок нашага народа.

На мітынгу прынята рэзалюцыя, у якой гаворыцца:

«У Советы дэпутатаў працоўных пашлём лепшых людзей, працаздольных, апраўдаўшых сябе на рабоце, здольных праводзіць у жыццё совецкія законы. Не дапусцім у нашы рады класава-варожых элементаў. Згуртаваныя вакол партыі Леніна—Сталіна, мы яшчэ раз прадэманстрыруем актыўным удзелам у выбарах нашу адданасць партыі большэвікоў і вялікаму Сталіну».

С. Эцін,
загадчык оргінструктарскім аддзелам Крынкаўскага райкома партыі.

На мітынгу ў Беластоцкім педінстытуце

Вясёлыя, жыццерадасныя юнакі—студэнты і студэнткі інстытута сабраліся ў актавай зале на мітынг, прысвечаны пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях БССР. Прысутнічаюць выкладчыкі і работнікі інстытута. Мітынг адкрывае дырэктар інстытута тав. Краўчанка.

Слова прадастаўляецца выкладчыку тав. Пілюціну. Ён гаворыць аб Указе Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, аб радасным і шчаслівым жыцці працоўных совецкай краіны, аб праве працоўных выбіраць і быць выбранымі.

Моладзь у капіталістычных краінах пазбаўлена выбарчых правоў. Там яна асуджана на невуцтва, на жабрацтва. Совецкая моладзь — адзіна шчаслівая моладзь у свеце. Аб ёй клапоціцца партыя Леніна—Сталіна, клапоціцца ўвесь совецкі народ. Кожны малады грамадзянін нашай краіны мае права на асвету, на працу, мае права выбіраць і быць выбраным.

У рэзалюцыі, прынятай аднагалосна, удзельнікі мітынга заклікаюць выбіраць у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных людзей, адданых партыі большэвікоў і соцыялістычнай радзіме, лепшых рабочых, работніц і прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Студэнты педінстытута абавязаліся вучыцца на «выдатна» і «добра». Увесь калектыў педінстытута абавязаўся прыняць актыўны ўдзел у правядзенні выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Н. ДЗЕЙКУН.

ДАДЗІМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЕ МАГУТНЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ КАДРЫ

Мудрае рашэнне

Мы, маладыя рабочыя 2-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната, з вялікай радасцю сустрэлі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР», а таксама пастанову Соўнаркома СССР аб стварэнні Галоўнага ўпраўлення працоўных Рэзерваў і аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і Школы Фабрычна-Заводскага Абучэння.

Гэта мудрае рашэнне ўрада прадастаўляе для гарадской і калгаснай моладзі велізарную магчымасць набыць розныя прамысловыя кваліфікацыі.

У былой панскай Польшчы працоўная моладзь не мела магчымасці паступіць на работу, не гаворачы ўжо аб тым, каб за рахунак дзяржавы набыць кваліфікацыю слесара, майстра і т. д.

Дзякуючы совецкай уладзе наша моладзь атрымала права на працу. Ні ў адной капіталістычнай краіне такіх правоў моладзь не мае. Толькі ў краіне соцыялізма дзяржава не толькі бясплатна абучае розным вытворчым спецыяльнасцям, але і ў час абучэння бярэ ўсіх навучаючыхся на сваё ўтрыманне.

Мы горача вітаем рашэнне ўрада, якое накіравана на ўмацаванне магутнасці нашай вялікай радзімы, на яшчэ большы рост соцыялістычнай прамысловасці.

Маладыя рабочыя 2-га камбіната:
Ш. Вайнер, Б. Лернер, А. Шымчук, А. Памеранец.

Краіна атрымае высокакваліфікаваных майстраў

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах мае вялікае значэнне для нашай соцыялістычнай прамысловасці. Ён накіраван на тое, каб забяспечыць прамысловасць кваліфікаванымі кадрамі. Стварыўшы працоўныя рэзервы, мы тым самым яшчэ больш умацуем абароназдольнасць нашай радзімы.

У свой час я вучыўся ў школе ФЗВ. Ад школы я атрымаў многа практычных і тэарэтычных навыкаў і ведаў. Лічу, што ў створаных рамесленых вучылішчах моладзь атрымае яшчэ большыя вытворчыя навыкі. У асобе будучых выпускнікоў наша прамысловасць атрымае дастойныя рэзервы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

А. Крукаў,
дырэктар 24-й фабрыкі.

Камісія па прызыву моладзі ў рамесленыя вучылішчы, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння

У Беластоку створана камісія па прызыву моладзі ў рамесленыя вучылішчы, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. У састаў камісіі ўвайшлі старшыня горвыканкома тав. Ражноўскі, сакратар горвыканкома тав. Окунь, сакратар гаркома ЛКСМБ тав. Баркун, тав. Іванова (профсаюз шарсцянікаў) і старшыня фабкома плюшавай фабрыкі тав. Пятроўскі.

Такія-ж камісіі створаны ў Гродне, Бельскім, Скідэльскім, Заблудаўскім і іншых раёнах.

АГІТАЦЫЯ Ў ЦЭХУ

На камбінат паступілі газеты. Іх нясуць у цэхі чытчыкам. У абедзены перапынак яны арганізоўваюць гучнае чытанне газет, растлумачваюць прачытанае.

Паслухаць добры артыкул, даведацца аб міжнародных навінах жадае кожны рабочы. І абедзены перапынак скарыстоўваецца для масавай работы, для чытак.

Асабліва разгарнулі сваю работу агітатары і чытчыкі трэцяга камбіната пасля апублікавання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах. Тэкст гэтага Указа чытаюць у цэхах на рускай, беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.

Велізарная цікавасць калектыва да выданага Указа. Як правіла, пасля чыткі пачынаецца гутарка. Рабочыя дзеляцца сваімі думкамі, выказваюцца аб тым, якое велізарнае народна-гаспадарчае значэнне мае Указ. У прадзільным цэху пасля гучнай чыткі брыгадзір сельфактара тав. Паплаўская сказала:

— Наша партыя і ўрад клапоцяцца аб нас, аб нашых дзецях, аб тым, каб стварыць усе ўмовы для вырашчвання добрых кваліфікаваных майстраў.

Пасля чыткі Указа ў ткацкім цэху слова ўзяў вучань-ткач 16-гадовы Генрых Шэставіцкі. Яго прамова была кароткай:

— Толькі пры совецкай уладзе няма беспрацоўных, — сказаў Генрых.—Я атрымаў магчымасць набыць кваліфікацыю. Гэта дзякуючы совецкай уладзе.

У заключэнне Генрых выказаў жаданне вучыцца ў рамесленым вучылішчы.

Агітатары і чытчыкі любяць сваю справу, з радасцю нясуць жывое большэвіцкае слова ў масы. Адным з лепшых агітатараў на камбінаце лічыцца тав. Еліна. Яе агітацыя змястоўная. Веданне некалькіх моў у многім дапамагае ёй у правядзенні агітацыйна-масавай работы.

Добрым чытчыкам у прадзільным цэху з'яўляецца работніца тав. Мацiеўская. Яна рэгулярна праводзіць чыткі і карыстаецца аўтарытэтам сярод калектыва свайго цэха.

Агітатары 3-га камбіната робяць вялікую і карысную справу. Яны растлумачваюць масам рашэнні партыі і ўрада, даводзяць іх да свядомасці рабочых.

І. Давыдаў.

На гродненскім шклозаводзе

Пры абмеркаванні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня рабочыя Гродненскага шклозавода абавязаліся ўзняць прадукцыйнасць працы, палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі, знізіць брак. Да выдання Указаў на заводзе была дрэнная працоўная дысцыпліна. Спазненні на 5—10 мінут з'яўляліся сістэмай, кантроль за яўкай на работу адсутнічаў.

Зараз гэтыя недахопы ліквідаваны. З прагульшчыкамі і дэзарганізатарамі вытворчасці вядзецца рашучая барацьба. Прыкметна ўмацавалася працоўная дысцыпліна на заводзе. Праведзеная работа дала свае станоўчыя вынікі: дзевяцімесячная праграма выканана на 105,9 процанта, завод даў дзяржаве 5.695 тысячы розных бутэлек. Знізіўся процант браку. Замест дапускаемых па плану 5 процантаў брак складае 4,3 процанта.

У сувязі з набліжэннем вялікага свята —23-й гадавіны Кастрычніка—на заводзе назіраецца вялікі вытворчы ўздым. Абмеркаваўшы пытанне аб дастойнай сустрэчы ўсенароднага свята, калектыў завода ўзяў на сябе абавязацельства выканаць да 27 кастрычніка месячную праграму і даць звыш плана 100 тысяч бутэлек. Рабочыя таксама абавязаліся к гэтаму дню закончыць пабудову другой ваннай печы, якая павялічыць выпуск бутэлек на 30 процантаў.

Брыгады шклодуваў далі слова штодзённа выконваць свой план не ніжэй, чым на 112—115 процантаў. Ужо ў першыя дні кастрычніка брыгада шклодува тав. Мускавец выконвае штодзённа сваё заданне на 133 процанты і знізіла брак да 1,5 процанта. Брыгада тав. Шостака выконвае дзённае заданне на 134 процанты, брыгада тав. Макарэвіча— на 142 процанты.

Г. Лупсякоў.



Стэфанія Александраўна Пліс — лепшая снавальшчыца 31-й беластоцкай плюшавай фабрыкі. 43 годы яна працуе на фабрыцы. Тав. Пліс сістэматычна перавыконвае норму і дае шоўк добрай якасці.
Фота А. Сапіра.
Фотахроніка БЕЛТА.



У слясарным цэху Мінскай школы ФЗВ чыгуначнікаў, на базе якой ствараецца чыгуначнае вучылішча. Злева — інструктар К. П. Рагачэўскі, які мае 30-гадовы стаж слясарнай работы.
Фота І. Шышко. Фотахроніка БЕЛТА.

Чыгуналіцейны завод на ўздыме

На сцяне прахадной будкі—шыльда «Чыгуналіцейны завод «Белмашстанкатрэста». Уваходзім на тэрыторыю завода. На велізарнай каменнай трубе лічбы «1898 год». Гэта год у якім пабудаван завод.

Да 1915 года на месцы, дзе цяпер знаходзіцца невялікі чыгуналіцейны завод, было вялікае прадпрыемства, якое выпускала турбіны, тэкстыльныя машыны і іншае складанае абсталяванне. Тады тут быў машынабудаўнічы завод. Імперыялістычная вайна наклала след на гэта прадпрыемства. Большая частка абсталявання з яго была вывезена. Шэсць год завод бяздзейнічаў. І ў 1921 годзе былі распрадаваны апошнія станкі. У гэтым-жа годзе адзін беластоцкі лесапрамысловец купіў акцыі завода і арандаваў яго.

Пачаў працаваць ліцейны цэх. Паўтара дзесяткі рабочых, якія знаходзіліся на гэтым прадпрыемстве, жорстка эксплаатаваліся. На заводзе і па гэты дзень захаваліся некаторыя дакументы, якія сведчаць аб цяжкіх умовах працы.

З прыходам совецкай улады завод змяніў сваё аблічча. Перш за ўсё, прышлося ўбіраць бруд, які накапіўся за годы панавання гаспадара. З тэрыторыі завода было вывезена да тысячы кубаметраў адпрацаванай абгарэўшай зямлі.

Калектыў дружна ўзяўся за працу. Штодзённа ў яго ўліваліся ўсё новыя і новыя кадры.

Яглоўскі нікалі не працаваў. Ды, уласна кажучы, бессэнсоўна было шукаць работы.

Прышоўшы на завод, Яглоўскі заявіў, што хоча стаць фармаўшчыком. Яго прынялі. Цяпер Яглоўскі адзін з лепшых фармаўшчыкоў. План ён сістэматычна выконвае на 150 процантаў. Такія-ж паказчыкі дае фармаўшчык Бандарэвіч.

Такіх, як Бандарэвіч і Яглоўскі, на заводзе ёсць многа. Калектыў вырас. Цяпер тут працуе 83 чалавекі. Прыкметна павялічылася і прадукцыйнасць працы. Калі пры панаванні гаспадара сярэдняя выпрацоўка на аднаго рабочага складала 86 кілограмаў чыгуннага ліцця, то цяпер сярэдняя выпрацоўка ўзрасла да 130 кілограмаў. Прадпрыемства выконвае цяпер адказнае заданне. План бягучага года прадугледжвае адліўку чыгунных дэталей для стругальнага станка Шэпінг. Штомесячна завод робіць 8—9 адлівак, у той час, калі да прыходу Чырвонай Арміі на заводзе праводзілася адна адліўка ў месяц.

Асабліва палепшылася работа завода пасля выдання Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. Гэта адчуваецца ва ўсім: і ў паляпшэнні якасці, і ва ўзросшай арганізаванасці калектыва. За апошні час зусім ліквідаваны прагулы.

Вялікіх поспехаў дабіліся перадавыя людзі соцыялістычнай вытворчасці. Сярод іх выдзяляецца фармаўшчык Міхаіл Дайліда са сваім сынам Станіславам. Бацька і сын спаборнічаюць паміж сабой. Міхаіл Дайліда працуе без браку, выконвае свой план на 150 процантаў. Station Станіслаў дае штодзённа звыш двух норм. На заводзе працуе і другі сын тав. Дайліда Казімір. Ён таксама перавыконвае нормы выпрацоўкі.

Выдатных вынікаў дабіўся таксама фармаўшчык Антон Меляхоўскі, які выконвае норму на 161 процант. Вацлаў Багусловіч дае штодзённа 140 процантаў да плана. Ад фармаўшчыкоў не адстаюць і рабочыя іншых прафесій. Узяць, напрыклад, абрубшчыка тав. Федасюка. Ён выконвае план на 169 проц.

На чыгуналіцейным заводзе з ліку старых кадравых рабочых выраслі камандзіры вытворчасці, усёй душой адданыя свайму соцыялістычнаму прадпрыемству.

Ліцейшчык Канстанцін Менпэль працуе на заводзе з дня яго заснавання—з 1898 года. Шмат чаго перажыў і бачыў гэты стары кадравы рабочы. Цяпер ён вылучан начальнікам ліцейнага цэха. Кадравы рабочы—мадэльшчык Адамскі працуе брыгадзірам.

Калектыў завода разгарнуў актыўную падрыхтоўку да прадстаячай слаўнай XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

І. Апельбаум.

ПА СТАРОНКАХ НІЗАВОГА ДРУКУ

У баку ад вытворчасці

Газета «Энергетык»—орган парткома і прафкома Беластоцкай электрастанцыі. Апошні нумар газеты прысвечан гадавіне вызвалення Заходняй Беларусі. Наступіла другая палова кастрычніка, а газета чамусьці не выходзіць.

Артыкулы і заметкі пішуцца на польскай і рускай мовах. У артыкуле пад загалоўкам «Чаму ўрачыста і радасна святкуем 17 верасня» адзначаюцца поспехі працоўных вызваленай зямлі, дасягнутыя дзякуючы пленнай, мірнай працы. Указваючы не перажываемыя намі цяжкасці росту, артыкул зводзіць іх толькі да міжнароднай абстаноўкі і нічога не гаворыць аб неабходнасці ўсямернага павышэння прадукцыйнасці працы, як асноўнай умовы ў барацьбе за камунізм.

Артыкул «Прайшоў год» напісаў рабочы Л. І. У ім расказваецца, як працоўныя Заходняй Беларусі былі кінуты незадачлівымі кіраўнікамі былой буржуазнай Польшчы на волю лёсу і жахі вайны. У артыкуле з любоўю і радасцю апісваецца прыбыццё Чырвонай Арміі ў Беласток.

У гэтым — вартасці газеты.

Як недахоп, трэба адзначыць, што ў газеце ні слова не гаворыцца аб становішчы на электрастанцыі, аб рабоце калектыва, не папулярызуюцца стаханаўцы, не выкрываюцца гультаі, прагульшчыкі.

Артыкул «У любімую армію» і «Наша армія—дзецішча народа» прысвечаны прызыву ў Чырвоную Армію. Маладыя рабочыя электрастанцыі тт. Карлюк, Пасюк, Патмальнік, Шумскі і іншыя ідуць у Чырвоную Армію. Здавалася-б, што рэдкалегія ў першую чаргу павінна іх запрасіць, каб яны выказалі свае думкі і пачуцці на старонках газеты. Але гэтага не зрабілі.

І ў астатніх нумарах газеты становішча не лепшае. Артыкулы вялікія па размеру і не канкрэтныя, прычым напісаны выключна на рускай мове. Рэдкалегія чамусьці забывае, што большасць рабочых на электрастанцыі палякі, што трэба з імі гаварыць на іх роднай мове.

Газета не жывая таму, што не масавая, бо пішуць у яе толькі некаторыя работнікі станцыі. Рэдкалегія забывае аб тым, што да ўдзелу ў газеце трэба прыцягнуць увесь калектыў электрастанцыі.

Выканалі гадовы план

Разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва паміж паасобнымі заводамі будаўнічых матэрыялаў, трэст будматэрыялаў заходніх абласцей Беларусі выканаў гадавы план па выпуску цэглы-сырца на 101,3 процанта.

Па Беластоцкай вобласці гадовы план выканан на 108,9 процанта.

В. Драпкін,
выконваючы абавязкі кіраўніка трэста будматэрыялаў.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА

На беластоцкім скурзаводзе № 1 разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Лепшыя стаханаўцы паказваюць узоры працы на вытворчасці. Стаханавец Павірхоўскі выконвае сваё заданне на 314 процантаў, Свежынскі — на 295 процантаў, Хабароўская — на 254 процанты, Бланштэйн— на 180 процантаў.

Да кастрычніцкіх свят на заводзе будзе адкрыт новы клуб.

За дастойную сустрэчу вялікага свята

ВАЎКАВЫСК. (**Ад нашага карэспандэнта**). Калектыў рабочых Ваўкавыскай механічнай майстэрні Беластоцкага спіртатрэста абавязаўся дастойна сустрэць XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Свае абавязацельствы калектыў паспяхова ажыццяўляе.

Майстэрня закончыла капітальны рамонт 15 спіртзаводаў. Асобныя майстры на рамонце заводаў паказалі выдатныя ўзоры соцыялістычнай працы. Малады токар прызыўнік Леон Давішок выконвае нормы выпрацоўкі на 120 — 130 процантаў. Токар Міхаіл Зданоўскі ўвесь час заданне выконваў на 130 процантаў. Слесары Іван Пашкоўскі, Тадэўш Берсткевіч, Генрых Прэрль на любой рабоце па рамонту абсталявання заводаў паказваюць узоры стаханаўскай работы.



Тав. Шустэр М. Я. — лепшы стаханавец беластоцкай швейнай фабрыкі «Ателье мод», узнагароджаны Наркамлегпромам СССР.
Фота А. Сапіра.

ПАРАДЫ АГРАНОМА

ЯК АБМАЛАЧВАЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ НАСЕННЕ ЛУБІНУ

Паніжэнне тэмпературы і павелічэнне ападкаў у другой палове лета і верасня падоўжылі ў гэтым годзе вегетацыйны перыяд лубіну і павялічылі нераўнамернасць яго паспявання, асабліва на больш звязаных глебах і на нізінных месцах.

Частка пасеваў лубіну ў БССР убіралася нават у верасні месяцы, нярэдка ў дажджлівае надвор'е, калі лубін з наяўнасцю недаспелых раслін недастаткова добра прасыхаў на полі пасля ўборкі. Захоўваць такі лубін у хлявах і гумнах у неабмалочаным выглядзе да зімы або вясны, як гэта часта рабілася ў папярэднія годы, нельга. Пры такім захаванні лубін лёгка пакрываецца плесенню і насенне губляе ўсхожасць. Не прадстаўляецца таксама амаль ніякай магчымасці весці сістэматычны кантроль за становішчам складзенага лубіна і прымаць адпаведныя папераджальныя меры пры яго псаванні.

Ураджай насення лубіну можна захаваць у гэтым годзе толькі тады, калі ён будзе хутка абмалочан і насенне яшчэ восенню, да наступлення замаразкаў, высушана і даведзена да становішча яго нармальнай вільготнасці.

Абмалот насеннага лубіну вытвараецца на звычайных зерневых малатарнях, як складаных, так і конных. Калі пры абмалоце сыраватага лубіну элеватар малатарні забіваецца, то яго выключаюць. Дэку трэба ўстанавіць так, каб не было бітага насення. Каб пазбегнуць псавання насення, ворах з-пад малатарні трэба неадкладна прапусціць праз веялку. Лепшай веялкай-сартыроўкай для лубіну з'яўляецца «Клейтон № 5» з прабіўнымі сітамі. Пасля ачысткі на веялцы «Клейтон», а калі яе няма, на сартыроўцы «Трыумф» насенне прапускаюць праз сартыроўку «Змейку». Толькі добра праведзеная сартыроўка, пры якой аддзяляецца набухшае, буйнае, загніўшае, бітае і шчуплае насенне, — забяспечвае ў далейшым лепшую сушку насення і яго захаванне.

Пасля малацьбы і сартыравання ўся ўвага павінна быць звернута на сушку насення і давядзенне вільготнасці яго да нармальнай (15-16 процантаў). Як правіла, трэба пры сушцы насення і яго захаванні рабіць аднародныя партыі, гэта значыць сухое насенне не змешваць з вільготным. Калі насенне лубіну мае невялікую вільготнасць, то можна абмежавацца натуральнай сушкай, для чаго насенне рассыпаецца тонкім слоем у 10-15 сантыметраў у сухім, добра вентыліруемым памяшканні. Але такая сушка насення магчыма толькі пры сухім надвор'і і пры адсутнасці заплеснелага і недаспелага.

Калі насенне вільготнае, і асабліва, калі сартыраваннем не знішчана поўнасцю заплеснелае, недаспелае і шчуплае насенне, то патрэбна штучная сушка. Шырока трэба скарыстаць у соўгасах і калгасах сушку насення лубіну ў апальваемых памяшканнях. Для сушкі выбіраецца свабодная хата або пакой, дзе ўстанаўліваюць жалезную або цаглянуую печку і робяць з дошак полкі—сцелажы, на якіх тонкім слоем рассыпаецца насенне. Такое памяшканне ўвесь час неабходна праветрываць пры дапамозе адкрыцця фортачак і топак печкі, а насенне перамешваць. Насенне лубіну можна прасушваць і на звычайных зернасушылках, калі яны ёсць у калгасах і соўгасах. Але тут пры сушцы трэба сачыць, каб тэмпература насення павышалася пасля нагрузкі насення паступова і не паднімалася-б к канцу сушкі вышэй 40° Цэльсія. Больш высокая тэмпература пры сушцы, чым 40° Цэльсія, вядзе да паніжэння ўсхожасці насення. Гэта прымушае асабліва сачыць за тэмпературай пры сушцы ў сушылцы.

Сушыць насенне да таго часу, калі яно пры раскусванні не расціскаецца, а раздрабляецца. Сухое насенне слаба паддаецца сціскванню ў руцэ, а вільготнае сціскаецца мацней. Пры высыпанні на падлогу сухое зярно лубіну дае сухі трэск, чаго не дае вільготнае.

Калі сушка вытвараецца ў сушылках, то неабходна ад партыі насення ў пачатку сушкі і ў канцы ўзяць пробы і праверыць на ўсхожасць. Калі ўсхожасць пасля сушкі не панізілася, то гэта значыць сушка рабілася правільна. Паніжэнне-ж усхожасці насення пасля сушкі паказвае, што пры сушцы была дапушчана высокая тэмпература або насенне было запарана. Гэта пакажа, што пры сушцы наступнай партыі на ўрэгуліраванне тэмпературы трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Па сканчэнні сушкі насенне прапускаецца праз сартыроўку, каб аддзяліць заплеснелае зерне. Гэта зрабіць лёгка, бо велічыня такіх зярнят у рэзультаце сушкі памяншаецца.

Прасушанае насенне ссыпаюць для хавання ў сухое, добра вентыліруемае памяшканне. Таўшчыня слою пры хаванні вызначаецца якасцю насення: сухое, добраякаснае насенне можна захоўваць слоем у 50 сантыметраў, а больш вільготнае — 20-30 сентыметраў. За насеннем пры захоўванні трэба весці сістэматычны догляд: праветрываць памяшканні і перлапачваць насенне. Гэта трэба рабіць у сухое, марознае надвор'е, а ўвосень пры сырым надвор'і — раніцай або ноччу, калі тэмпература паветра паніжаецца. У выпадку выяўлення ачагоў саграванні або паяўлення плесені на насенні, неадкладна трэба прапусціць яго праз сартыроўку і захоўваць у далейшым больш тонкім слоем. Сушка і захаванне насення лубіну ў соўгасах і калгасах павінна быць даручана спецыяльна вылучанай асобе, бо толькі ў такім выпадку можа быць забяспечан поспех.

Зямельныя органы, дырэктары машынна-трактарных станцый і соўгасаў, старшыні калгасаў павінны прыняць неабходныя меры для хутчэйшага заканчэння абмалоту і лепшага захавання лубіну з тым, каб вясеннюю пасяўную кампанію 1941 года забяспечыць добраякасным насеннем.

М. Гродскі,
навуковы супрацоўнік Беларускай селекцыйнай станцыі бабовых культур.

Хутчэй закончыць абмалот і загатоўку насення траў

Беластоцкая вобласць мае вялікія пасевы насеннікаў траў. Згодна пастановы Соўнаркома БССР, з ураджаю 1940 года па вобласці неабходна загатовіць у парадку дзяржаўных закупак 750 цэнтнераў насення канюшыны, 900 цэнтнераў лубіну, 1000 цэнтнераў вікі і 700 цэнтнераў серадэлы. Аднак загатоўка гэтага насення праходзіць зусім дрэнна.

Асноўнай прычынай дрэннага ходу загатовак з'яўляецца тое, што ў радзе раёнаў (Гродненскі, Саколкаўскі і іншыя) абмалот насеннікаў не пачат. Зямельныя органы гэтай справай не цікавяцца. Практыка паказвае, што зацяжка з абмалотам прыводзіць да вялікай страты насення.

У мэтах хутчэйшага заканчэння абмалоту і закупак насення канюшыны, цімафееўкі і вікі Соўнарком БССР дазволіў да 1 снежня 1940 года рабіць закупку насення канюшыны, вікі і цімафееўкі з залічэннем у лік абавязковых паставак зярна дзяржаве і натуралаты за работу МТС па наступнаму эквіваленту: 1 цэнтнер праданага насення канюшыны за 4 цэнтнеры зернавых культур, 1 цэнтнер насення цімафееўкі за 3 цэнтнеры зернавых, 1 цэнтнер вікі за 2 цэнтнеры зернавых.

Калгасы, якія прадаюць дзяржаве насенне канюшыны, цімафееўкі і вікі, пасля выканання плана абавязковых паставак зернавых культур, звароту насеннай ссуды, засыпкі насенных фондаў і разліку за работу МТС, а таксама аднаасобныя гаспадаркі, якія прадаюць дзяржаве насенне канюшыны, цімафееўкі і вікі, пасля выканання абавязковых паставак зернавых культур маюць права атрымаць з пунктаў «Заготзярно» насенне зернавых культур па ўстаноўленаму эквіваленту. Насенне зернавых культур адпускаецца па загатоўчай цане з налічэннем 2 руб. за цэнтнер.

Неабходна адзначыць, што незалежна ад атаварвання зярном за насенне траў выплачваецца загатоўчая цана ў поўным размеры і, акрамя гэтага, калгасы і соўгасы, з якімі заключаны дагаворы на продаж насення траў, атрымоўваюць да 1 снежня прэміі-надбаўкі да загатоўчай цаны пры ўмове продажу звыш колькасці, указанай у дагаворы.

Водпуск зернавых культур пад загатоўку траў будзе вытрарацца толькі да 1 снежня. Таму задача загатоўчых і раённых зямельных органаў — шырока растлумачыць рашэнне ўрада і арганізаваць масавы абмалот і продаж дзяржаве насення траў. Наша хутка растучая сацыялістычная жывёлагадоўля патрабуе ўсямернага пашырэння кармовай базы, а таксама сістэматычнага паляпшэння лугоў і пасбішчаў. Стварэнне насенных фондаў траў мае выключнае значэнне ў справе забеспячэння гэтых мерапрыемстваў.

І. Іокаў,

аграном Беластоцкай абласной насеннай базы «Дзяржсортфонда».

Справы ідуць па-старому

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Тэмпы здачы бульбы дзяржаве па Граеўскаму раёну па-ранейшаму вельмі нізкія. Прырост за мінулую пяцідзёнку склаў усяго каля 20 процантаў. Нездавальняюча разгортваюцца ўборачныя работы. Не глядзячы на тое, што некаторыя сельсаветы і калгасы значна палепшылі работу, усё-ж у радзе сельсаветаў уборка бульбы праходзіць самацёкам.

Адным з адстаючых у раёне з'яўляецца Нечынскі сельсовет. Тут план выканан толькі на 25 процантаў. І не дзіўна, што сельсовет займае адно з апошніх месц па здачы бульбы дзяржаве. Гэтыя факты — вынік слабай масава-растлумачальнай работы сярод сялян. Старшыня сельсовета тав. Младзіноўскі ўсё яшчэ прытрымліваецца такой думкі: зіма далёка, паспеем, справімся.

На хутчэйшае заканчэнне ўборкі і здачы бульбы дзяржаве да апошняга часу не быў мабілізаван і кіруючы раённы актыў. Па пытанню ўборкі і загатоўкі бульбы многа вынесена пастаноў, але большасць з іх, як правіла, не выконваецца. Не на вышыні палажэння аказаліся работнікі райзямаддзела і ўпаўнаркамзага. Кіраўнікі іх тав. Загідулін і Азбукін недастаткова аказваюць практычную дапамогу на месцах.

Вялікім тормазам у загатоўках з'яўляецца дрэнная арганізацыя прыёмкі бульбы на загатоўчых пунктах. Віна гэта перш за ўсё кладзецца на аблупаўнаважанага Наркамата загатовак. Прывядзем некалькі фактаў. Перад пачаткам загатовак з вобласці паведамілі, што ў раёне будзе праводзіцца прыёмка ў трох пунктах. Яны былі абсталяваны і пачалі прыёмку бульбы. Прайшло тры дні, і аблупаўнаркамзаг даў распараджэнне спыніць прыёмку бульбы на гэтых пунктах, а здатчыкаў накіраваць на Грабоўскі пункт, які знаходзіцца ў другім раёне.

Такім чынам атрымалася так, што сяляне прывозяць бульбу ў Граева, а адсюль іх накіроўваюць у Грабова за 60 кілометраў. На грабоўскім-жа пункце да прыёмкі падрыхтаваліся дрэнна. Тут сяляне прастойваюць суткамі, прычым разлікі з здатчыкамі не робяцца на месцы.

В. Гарбанёў.

НЯГОДНЫ МЕТАД КІРАЎНІЦТВА

ГРОДНА. **(Ад нашага карэспандэнта).** — Уборка бульбы зацягваецца, азімыя яшчэ не пасеяны. Што рабіць, за што ўхапіцца?—разважае старшыня калгаса імені Парыжскай комуны, Лошынскага сельсовета, тав. Салей.

У чым-жа справа? Чаму ў калгасе зацягваюцца сельскагаспадарчыя работы? Калгасу патрэбна ўбраць 32 гектары бульбы. Працаздольных калгаснікаў 250 чалавек. Рабочай сілы, як відаць, дастаткова. Аднак в сельскагаспадарчымі работамі калгас адстае. Прычына адставання ў тым, што праца ў калгасе не арганізавана. На ўборцы бульбы кожнаму калгасніку налічаюць 1,25 працадня, незалежна ад колькасці і якасці работы.

На канюшні абязлічка,—коні не замацаваны за асобнымі калгаснікамі. Сельскагаспадарчы інвентар таксама абязлічаны.

Зусім па іншаму налічаюць працадні плотнікам і кавалям. Кожны дзень запісваюць па 2—3 працадні, незалежна ад таго, працуюць яны ці гуляюць. Наогул, учот працадзён у калгасе не наладжан. У працоўныя кніжкі калгаснікаў працадні да гэтага часу не запісаны за верасень месяц. Размяркоўваючы авансам на працадні бульбу, праўленне калгаса выдала ўсім пароўну—па 12 вошыкаў. Гэта грубае парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі прывяло калгас да прарыву.

Так абстаіць справа з арганізацыяй працы ў многіх калгасах Гродненскага раёна.

Нельга сказаць, што кіраўнікі гэтых калгасаў не жадаюць працаваць або наладзіць арганізацыю працы. Яны стараюцца, каб як найлепш наладзіць справу. Але ў іх часам нехапае вопыту.

Раённыя арганізацыі павінны былі дапамагчы праўленням калгасаў на месцы сваімі парадамі, як лепш арганізаваць працу, расставіць рабочую сілу і т. д. Аднак гэтай дапамогі яны не атрымліваюць. Работнікі райзямаддзела замест канкрэтнага кіраўніцтва калгасамі пішуць дзесяткі цыркуляраў, у якіх цяжка разабрацца. Аграном райзямаддзела тав. Соркін у калгасах наогул не бывае.

Па сутнасці, зямельнага аддзела ў раёне не адчуваецца. Яго функцыі выконвае райком партыі. Райком пават кіруе перакідкай малатарняў, у райком ідуць брыгадзіры, старшыні калгасаў па такіх пытаннях, якія з поспехам могуць быць вырашаны і павінны вырашацца ў райзямаддзеле. Бясспрэчна, што райком павінен унікаць ва ўсе дэталі гаспадарчага жыцця раёна, але-ж не падмяняць райза.

Райком партыі ажыццяўляе кіраўніцтва калгасамі галоўным чынам праз сваіх упаўнаважаных. Да калгаса імені Парыжскай комуны быў прымацаван адзін такі ўпаўнаважаны тав. Пікман. Па словах сакратара райкома тав. Кавалёва, тав. Пікман часта бываў у калгасе і ўзнімаў там пытанні на «належную вышыню». Пра тое, як упаўнаважаны дапамагай калгасу ў наладжванні работы, калгаснікі гавораць так:

—Упаўнаважаны з раёна за ўвесь час прыязджаў да нас два-тры разы. Карысці з гэтага вельмі мала. Ён прыедзе, паходзіць па калгасным двары, пагутарыць з старшынёй і паедзе.

Г. Лупсякоў.

Да вынікаў гастролей Дзяржаўнага тэатра Юнага гледача ў Беластоку

10 тысяч гледачоў

Спектаклем «Як гартавалася сталь» тэатр юнага гледача БССР закончыў свае гастролі ў Беластоку. За час работы ў Беластоку (з 22 верасня па 14 кастрычніка) калектывам тэатра сыграна 22 спектаклі і абслужана 10 тысяч юных і дарослых гледачоў горада. Тэатр палюбілі новыя гледачы свабоднага совецкага Беластока. Асаблівым поспехам карысталіся спектаклі «Цудоўная дудка» В. Вольскага, «Як гартавалася сталь» Н. Астроўскага і «Снежная каралева» Е. Шварца.

Апрача сваіх пастановак, у памяшканні тэатра «Палас» акторы тэатра правялі вялікую грамадскую работу сярод сваіх гледачоў. З поспехам выступала на дапрызыўных пунктах перад новым папаўненнем нашай слаўнай Чырвонай Арміі канцэртная група тэатра. 5 кастрычніка тэатр сустрэўся з вучнямі і настаўнікамі 9-й поўнай сярэдняй школы. У цёплай таварыскай гутарцы акторы расказалі сваім гледачам аб творчай рабоце над спектаклем «Як гартавалася сталь», аб будучых планах тэатра. Юныя гледачы вельмі цікавіліся жыццём і работай свайго тэатра. Вялікую карысць прынесла акторам сустрэча з пісьменнікамі Беластока, прысвечаная абмеркаванню новай п'есы аб совецкай школе «На парозе жыцця» Н. Таубе.

Калектыў тэатра юнага гледача выехаў у Мінск, дзе будзе працягваць сваю работу па падрыхтоўцы да паездкі ў Маскву — на Усесаюзны агляд дзіцячых тэатраў. Гэтую дату тэатр сустрэне выпускам двух новых спектакляў: класічнай камедыі Мальера «Плутні Скапена» і сучаснай п'есай Н. Таубе «На парозе жыцця». Адначасова будзе абнаўляцца і адшліфоўвацца спектакль «Цудоўная дудка», які тэатр пакажа ў Маскве 18 лістапада. Паездка тэатра ў Маскву — вялікую сталіцу нашай радзімы—натхняе калектыў тэатра да новых творчых поспехаў. Пажадаем маладому таленавітаму калектыву —тэатру шчаслівага юнацтва Совецкай Беларусі — добрага шляху!

Творчыя задачы і перспектывы

Спектаклямі ў Беластоку Мінскі тэатр Юнага гледача закончыў свае гастролі па заходніх абласцях нашай рэспублікі. Наперадзе ў калектыва тэатра вялікая творчая работа. Заканчваючы выпуск новых спектакляў — «На парозе жыцця» Н. Таубе і «Плутні Скапена» Мальера, тэатр Юнага гледача прыступае да ажыццяўлання двух найбольш складаных і значных твораў свайго рэпертуара. Такімі работамі для тэатра з'явіцца п'еса «Большэвікі» Любашэўскага, прысвечаная палкаму рэвалюцыянеру сацыялістычнай рэвалюцыі Якаву Свердлову, і п'еса А. Н. Астроўскага «Снягурачка». Работы над гэтымі спектаклямі павінны ўзбагаціць нашага юнага гледача ведамі аб жыццёвым шляху слаўнага ленінца, бясстрашнага большэвіка Якава Свердлова, пазнаёміць з спадчынай славутага рускага драматурга Астроўскага. Разам з тым гэтыя творы дадуць магчымасць нашаму тэатру выявіць у значнай меры свае сапраўдныя творчыя сілы.

У красавіку 1940 года тэатр адзначае свой 10-гадовы юбілей. Пройдзен значны шлях развіцця і фарміравання ў Беларусі першага дзіцячага тэатра. Тэатрам накоплен вялікі вопыт работы з гледачамі. За гэтыя годы тэатр наведала больш мільёна школьнікаў. Створан рад цікавых і хвалюючых сучасных і класічных спектакляў. Значна вырас і акторскі ансамбль тэатра. Падводзячы вынікі свайго 10-годдзя, тэатр прыкладзе ўсе сілы, каб ажыццявіць свой намечаны творчы план, абагуліць у поўнай меры свой дзесяцігадовы творчы шлях.

М.М. Сухараў,

мастацкі кіраўнік тэатра.

Вялікае выхаваўчае значэнне

Некалькі год таму назад, яшчэ ў панскай Польшчы, мне ўдалося пазнаёміцца з кнігай Н. Астроўскага «Як гартавалася сталь». Калі я прачытала гэты цудоўны раман, перада мною адкрылася карціна новага жыцця.

А цяпер я з вялікай радасцю хадзіла паглядзець на сцэне тэатра Юнага гледача БССР мой любімы твор.

Мне надоўга запомніўся бясстрашны сын ленінскага комсамола Павел Карчагін, які паставіў перад сабой мэту — змагацца за лепшае, светлае жыццё для свайго народа. Павел Карчагін не баіцца ніякіх перашкод на сваім шляху. Для справы ён не шкадуе свайго жыцця.

Вельмі трагічна паказана ў спектаклі масавая сцэна ў турме. Тут акторы з вялікай страснасцю і праўдзівасцю перадалі мужнасць герояў — юных комсамольцаў. Гэта сцэна вельмі ўздзейнічае на гледачоў. Немагчыма перадаць, што я перажывала, калі Валя, ідучы на смерць, заспявала сваю любімую песню.

Ясна толькі адно: калі тэатр імкнуўся разбудзіць у гледачоў сімпатыю да геранчых подвігаў у славу нашай радзімы, — ён свае імкненні ажыццявіў.

Спектакль «Як гартавалася сталь» мае вялікае выхаваўчае значэнне для новых юных гледачоў.

Берэнштэйн.

настаўніца 9-й сярэдняй школы

Абгаварэнне новай п'есы

П'еса «На парозе жыцця» драматурга Таубе паказвае жыццё совецкай моладзі, вучняў-дзесяцікласнікаў. Праблемы, пастаўленыя ў п'есе — спалучэнне вучобы з гераізмам, узаемаадносіны вучняў і бацькоў, вучняў і настаўнікаў, таварыства ў вучнёўскім калектыве — хвалююць не толькі школу, але ўсю нашу совецкую грамадскасць. У нашай драматургіі мала добрых п'ес на гэту тэму. І ў гэтых адносінах п'еса «На парозе жыцця» вельмі актуальная і каштоўная.

Аўтар, відаць, добра ведае совецкую школу, ведае, чым жыве совецкі юнак ці дзяўчына, якія стаяць на парозе жыцця, ведае іх жыццерадаснасць і імкненне да гераізма, да дзеянняў у славу нашай радзімы. Таубе ўдалося праўдзіва паказаць шматграннасць школьнага жыцця. У абрысоўцы персанажаў аўтар перамог штамп і схематычнасць. У п'есе няма рэзка адмоўных і ідэальна бездакорных герояў. Усе вучні, паказаныя ў п'есе, глыбока станоўчыя па сваёй прыродзе, але ўсім ім уласцівы ў той ці іншай меры і недахопы.

Сваім вастрыём п'еса накіравана супроць пагардлівасці да вучобы і лёгкадумнасці некаторых юнакоў, якія імкнуцца абыйсці школу, абыйсціся без грунтоўных ведаў і заняць сваё месца ў жыцці, лёгка здабыўшы славу. Верхаглядства некаторай часткі вучнёўства ўмела выкрываецца ў п'есе праз вобраз дзесяцікласніка Ілы Корзуна. Бацька Корзуна — вядомы канструктар — заняты сваёй работай, мала ўдзяляе ўвагі выхаванню сына. І добры вучань, празмерна захапіўшыся вынаходніцтвам, закідае вучобу, а, нарэшце, і зусім пакідае школу. На дапамогу прыходзіць вучнёўскі і настаўніцкі калектыў, які звяртае Ілью на правільны шлях.

Дзесяцікласнікі паказаны будучымі героямі, патрыётамі сваёй радзімы. Вобразы Мікіты, Ірыны, старасты класа — гэта сапраўдныя совецкія вучні. Таварыская спайка, дружба, якая перарастае ў першае каханне, паказаны з тактам. Прыемнае ўражанне пакідаюць вобразы педагогаў, а таксама вобраз лётчыцы Марыны.

Са сваёй работай над п'есай тэатр пазнаёміў беластоцкіх пісьменнікаў. 10 кастрычніка адбылася сустрэча калектыва тэатра з пісьменнікамі, у час якой была зачытана па ролях п'еса «На парозе жыцця». Чытка п'есы прайшла пры напружанай увазе і зацікаўленасці прысутных.

У разгарэўшайся дыскусіі, выступаўшыя таварышы далі ў асноўным станоўчую ацэнку п'есы. Разам з тым яны ўказалі на рад недахопаў.

Пісьменнік тав. Сфард у сваім выступленні ўказаў, што персанажы п'есы псіхалагічна вытрыманы, створаны цэласныя характары. П'еса слухаецца з напружаннем. Аднак у ёй залішне сур'ёзнасці, перагрузкі матэрыялам, чаму спектакль будзе стамляць юнага гледача. Зацягнута фінальная сцэна развітання са школай, занадта доўгія маналогі, якія некалькі зніжаюць напружаны тон п'есы. Слаба паказан будучы кампазітар, вучань Мікіта, не заўсёды выклікае сімпатыі гледача староста класа, які па ходу п'есы павінен быць станоўчым вобразам.

На рад недахопаў у п'есе ўказалі тт. Равіч, Рыхнер, Заблудоўскі і інш.

Паэт Цімох Крысько звярнуў асаблівую ўвагу калектыва тэатра на павышэнне культуры мовы. Ён прывёў многа прыкладаў дрэннага перакладу тэкста п'есы на беларускую мову, а таксама няправільнага вымаўлення слоў некаторымі артыстамі.

Ёсць у п'есе некаторыя пагрэшнасці і педагагічнага характару. У першым акце, напрыклад, вучні нейкім даўно асуджаным брыгадна-лабараторным метадам калектыўна рашаюць задачы кантрольнай работы. Не зусім метадычна правільна паказан урок у другім акце. Настаўнікі замест устаноўленых урадам ацэнак ведаў («выдатна», «добра», «пасрэдна» і т. д.) чамусьці ставяць вучням тройкі і нават чацвёркі з мінусам.

Выступіўшы ў заключэнне мастацкі кіраўнік тэатра тав. Сухараў абяцаў выправіць у ходзе далейшай работы над п'есай указаныя недахопы.

Няма сумнення, што спектакль Беларускага дзяржаўнага тэатра «На парозе жыцця» будзе дастойным для паказу ў Маскве на ўсесаюзным праглядзе.

Т. Лясовіч.

Прыязджайце часцей да нас

Спектакль «Як гартавалася сталь» зрабіў на мяне вельмі моцнае ўражанне. П'еса Нікалая Астроўскага расказала мне аб велізарнай рабоце, прароблєнай за гады совецкай улады ў нашай краіне. Асабліва спадабаўся мне вобраз Паўла. Мне здавалася: тое, што адбываецца на сцэне, з'яўляецца сапраўднасцю. Па маёй думцы, артыст, які выконваў ролю Паўла, вельмі добра справіўся з сваёй задачай.

Я вельмі рада, што ў нас ёсць спецыяльны дзіцячы тэатр, які вучыць і выхоўвае нас у духу комунізма.

Хочацца, каб Мінскі тэатр Юнага гледача часцей прыязджаў да нас і паказваў нам свае выдатныя пастаноўкі.

Геня Мочкіна,

вучаніца 5 класа беластоцкай 30-й школы.

У польскай школе

У час вялікага перапынку комсорга школы шчыльна абступае вясёлая гурба дзяцей. Усе яны выказваюць сваю нястрымную радасць: яны любяць сваю совецкую школу.

— Я хачу стаць піонерам, — гаворыць Невільскі, смуглы сінявокі хлапчук.

— Але ён дрэнна вучыцца, — падказвае яго адзін з хлопчыкаў.

— Мы ўсе цяпер добра вучымся,—папраўляе малая Кнышынская, дачка рабочага 18-й тэкстыльнай фабрыкі.—У нас цяпер новыя кнігі, я зараз прынясу іх.

Яна бяжыць у клас і прыносіць новы совецкі падручнік на польскай мове.

— Сёння мы чыталі пра Мамлакат, як яна цудоўна збірала бавоўну.

Дзяўчынка радасна паказвае кнігу з апавяданнямі пра Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю, з вершамі Міцкевіча, апавяданнямі Канапніцкай.

Прыбыццё новых падручнікаў з'явілася сапраўдным святам.

— І вучоба пайшла зусім іначай,—гавораць настаўнікі.—Вось, глядзіце: Агустыняк Ігнацій у пачатку верасня адказваў на «дрэнна», затым прышлі падручнікі, і вось 21 верасня ён ужо адказаў на «добра», а 1 кастрычніка на «выдатна». Таксама і з вучнем Шэнкам і дзесяткамі іншых.



Піонеры 1-й беластоцкай польскай сярэдняй школы вядуць перапіску з піонерамі розных гарадоў СССР.

На здымку: піонеры за чыткай пісьма, атрыманага з г. Нара-Фомінска, Маскоўскай вобласці.

Фота А. Сапіра. Фотахроніка БЕЛТА.

А спачатку было цяжка. Хлопчыкі і дзяўчынкі прышлі ў школу нейкія маўклівыя, сумныя. Усё было для іх незнаёмым у новай школе, а вораг шэптам падказваў нешта, палохаў, угаварваў: не хадзіце ў школу, усё роўна з гэтага нічога не будзе. Не было яшчэ совецкіх падручнікаў на польскай мове, таму не паспявалі ў вучобе.

А цяпер з кожным днём становіцца лепш і лепш. У юных сэрцах пачаўся новы творчы працэс шукання праўды, адкідвання хлусні, якая стваралася старой школай.

На ўроку прыродазнаўства адказвае вучань Налівайка: з якім агнём з якой страснасцю гаворыць ён аб творах Дарвіна!

...Вясёлым смехам звініць піонерскі пакой. Малыя Стасі, Ясі і Крысі з захапленнем слухаюць расказ аб выдатных лётчыцах Осіпенка, Грызадубавай і Расковай. А калі піонерважатая пытае: хто з вас жадае быць лётчыцай, як Грызадубава,— падымаецца лес рук: усе!

Дзелісевіч ходзіць засмучаны. У яго класе ўжо 14 дзяцей—піонеры, а ён адчувае сябе такім адарваным, такім адзінокім.

Гісторыя Дзелісевіча кароткая. Ён першым уступіў у піонерскі атрад. Даў урачыстае абяцанне. Атрымаў чырвоны гальштук. Але не вытрымаў. Калі некаторыя пачалі над ім смяяцца, ён аднойчы прыбег у піонерскі пакой з плачам, пакінуўшы на стале піонерскі гальштук.

Цяпер яму шкада. Звярнуцца да комсорга—у яго нехапае смеласці. Ён зварачваецца да настаўнікаў і пытае: ці адновяць яго ў піонерах?

* * *

Вучні чытаюць многа. Школьная бібліятэка не ў сілах задаволіць іх патрабаванні. Яны чытаюць і Міцкевіча, і Ожэшка, і новую совецкую літаратуру, але ў першую чаргу яны ўсе патрабуюць: дайце нам кнігі Ванды Васілеўскай.

Глыбокае ўражанне аказалі новыя падручнікі на вучняў старэйшых класаў і на настаўнікаў.

— Я маю двух дачок,—расказвае настаўнік тав. Куткоўскі: адна ў восьмым класе, а другая ў сёмым. Калі яны атрымалі новыя совецкія падручнікі польскай літаратуры, яны проста не маглі ад іх адарвацца: за адзін дзень усё дачыталі да канца.

А трэба сказаць, што многія з вучняў і нават настаўнікі пад уплывам варожых шэптаў сумняваліся ў тым, ці будуць у нас польскія падручнікі. А тут раптам атрымалі новыя праграмы, кнігі, у якіх так абшырна, так праўдзіва, красачна гаворыцца аб Рэю і Каханоўскім, аб Міцкевічу і Славацкім, аб Ожэшка і Канапніцкай. Гэта была нечаканасць, прыемная і радасная для вучняў і настаўнікаў.

У школе № 4, як і ва ўсіх совецкіх польскіх школах Беластока, жыццё забіла крыніцай. Тысячы дзяцей, юнакоў і дзяўчат схіляюцца над новымі падручнікамі і пазнаюць з іх усё, што было прагрэсіўным і прыгожым у польскай літаратуры. Гэта магчыма толькі ў совецкай школе, толькі ў краіне Советаў.

Піонерскія, комсамольскія арганізацыі могуць і павінны цяпер расці і развівацца.

Комсорг тав. Хадзякава зразумела ўжо, што трэба навучыцца польскай мове, каб сапраўды цесна звязацца з дзетварой і плённа працаваць.

С. Натансон.

ЗА РУБЯЖОМ

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 15 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: Нашы самалёты скідвалі ўчора на Лондан бомбы самага буйнага калібра. У раёне паміж Гайд-паркам і Вест-Індскімі докамі адбыліся моцныя ўзрывы. На абодвух баках Тэмзы ўзніклі пажары, якія хутка ахапілі паблізу ляжачыя мясцовасці. Паўночнее Лондана разбураны ангары і сховішча аднаго з англійскіх аэрадромаў. Паспяховай бамбардыроўцы падвергся таксама ваенны лагер у Паўднёвай Англіі. На чыгуначныя збудаванні Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі былі скінуты ў некаторых пунктах бомбы самага буйнага калібра.

На падвергшыхся бамбардыроўцы англійскай авіяцыі тэрыторыях Германіі і акупіраваных абласцей прычынены нязначныя матэрыяльныя страты толькі збудаванням неваеннага значэння. Афяры маюцца толькі сярод грамадзянскага насельніцтва. Размешчаныя на абшырным прасторы і адзначаныя чырвоным крыжам будынкі бальніцы Вірхова ў Берліне зноў пацярпелі ад узрыва фугаснай бомбы.

Асабліва вялікія разбурэнні англійскія бамбардыроўшчыкі выклікалі ў апошнія дні ва французскім прыморскім горадзе Гаўры і на галандскай тэрыторыі. Многія будынкі пашкоджаны ад пажараў так, што частка грамадзянскага насельніцтва асталася без прытулку.

Праціўнік страціў учора 6 самалётаў, германская авіяцыя — 1. Тры нашых падводных лодкі знішчылі некалькі англійскіх суднаў агульным водазмяшчэннем у 36.175 рэгістравых брута-тон.

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

НЬЮ-ЙОРК, 15 кастрычніка. Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, пры апошняй бамбардыроўцы французскага ўзбярэжжа былі прычынены сур'ёзныя пашкоджанні Шэрбургу, Булоні, Кале і Дзюнкерку. У Шэрбургскіх сухіх доках англійскім флотам разбураны многія з будуючыхся і знаходзячыхся ў рамонце караблёў. Прамымі пападаннямі снарадаў прычынены моцныя пашкоджанні буйнай верфі «Напалеон» і часткі новай прыстані для трансатлантычных суднаў, дзе запалілася некалькі параходаў. Паблізу Шэрбурга пашкоджана таксама буйная база гідрапланаў.

У аперацыях удзельнічалі, галоўным чынам, эскадраныя мінаносцы і лёгкія крэйсеры.

НЬЮ-ЙОРК, 15 кастрычніка. Па паведамленню лонданскіх карэспандэнтаў агенцтваў Асошыэйтэд Прэс і Юнайтэд Прэс мінулай ноччу і сёння раніцай было бамбардыравана каля 40 пунктаў Лондана, а таксама некалькі раёнаў у Паўночна-Усходняй Англіі і адзін—у Цэнтральнай Англіі. На Лондан скінута некалькі тысяч фугасных і запальваючых бомб. Прычынены велізарнейшыя разбурэнні. Маецца многа афяр. Узнікла мноства пажараў. Бамбардыроўцы падвергся таксама горад Ліверпуль і ўсходняя частка Англіі, дзе знішчана некалькі будынкаў.

НЬЮ-ЙОРК, 15 кастрычніка. Па паведамленню «Нью-Йорк таймс» паміма Лондана бамбардыроўцы падвергліся раён Уэльса, Заходняе ўзбярэжжа Англіі і Ліверпуль.

Устраненне абломкаў з вуліц Лондана становіцца буйнай праблемай. Пасля ўчарашніх і сённешніх бамбардыровак яна становіцца яшчэ больш складанай.

Як перадае газета «Нью-Йорк геральд трыбюн», у час учарашняй бамбардыроўкі адна бомба папала ў сховішча, куды хутка хлынула вада. З знаходзячыхся ў сховішчы людзей выратавалася ўсяго 50 чалавек.

Англія і Румынія

НЬЮ-ЙОРК, 14 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення лонданскага карэспандэнта газеты «Нью-Йорк геральд трыбюн» за апошнія 24 гадзіны сувязь Лондана з англійскай дыпламатычнай місіяй у Бухарэсце перарвана. Чакаецца разрыў дыпламатычных адносін паміж Румыніяй і Англіяй.

Становішча ва Французскім Інда-Кітаі

НЬЮ-ЙОРК, 14 кастрычніка. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе з Ханоя, што мясцовыя французскія ўлады ў цяперашні час чакаюць прыбыцця японскай эканамічнай місіі. Мяркуюць, што японцы імкнуцца распаўсюдзіць свой уплыў на паўднёвую частку Французскага Інда-Кітая. Японскі прадстаўнік указаў, што эканамічная місія імкнецца развіць японскі гандаль на тэрыторыі ўсяго Інда-Кітая, уключаючы правінцыі Анам і Кохінхіна. Па думцы аглядальнікаў, магчыма, што Японія будзе атрымоўваць з Кохінхіны рыс і каучук. У цяперашні час рыс з гэтай правінцыі экспартыруецца галоўным чынам у англійскія ўладанні. Асноўная частка каучука прадаецца ЗША. Па словах карэспандэнта, у 1938 годзе ў Кохінхіне было выраблена 41 тыс. тон каучука.

ПРЫЁМ РЫКАРДЗІ ГІТЛЕРАМ

БЕРЛІН, 14 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што сёння ўдзень Гітлер у прысутнасці германскага міністра гаспадаркі Функа прыняў італьянскага міністра гандлю і валюты Рыкардзі.



У беластоцкім дзіцячым садзе № 2. Чырвонаармейцы — лепшыя прыяцелі дзяцей — прышлі ў госці да маленькіх любімцаў.

Фота А. Сапіра.

Провады маладых патрыётаў

Прызыў моладзі Беластока нараджэння 1917, 1918, і 1919 гадоў у рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі прайшоў на высокім палітычным узроўні. З прызыўнікамі праведзена 134 палітгутаркі і даклады, дадзена сіламі беластоцкіх артыстаў і мастацкай самадзейнасці 22 канцэрты, прадэманстрыравана 5 кінокарцін.

На прызыўным пункце ў час работы камісіі дзяжурылі інструктары горсовета, Асоавіяхіма і таварыства «Чырвонага Крыжа». 157 чалавек прызыўнікоў здалі тут-жа, на пункце, нормы на значок «Гатоў да санітарнай абароны», а 85 чалавек— на значок «Процілаветраная хімічная абарона». На пункце выпушчана пяць насценных газет і дзве фотагазеты.

З якой радасцю беластоцкая моладзь ідзе ў рады нашай Чырвонай Арміі! Аб гэтым сведчыць тое, што сотні юнакоў нараджэння 1920, 1921, 1922 гг. падалі заявы ў горваенкамат аб датэрміновым залічэнні іх у рады арміі.

Урач прызыўной камісіі тав. Шацкі піша ў сваёй заметцы ў апошнім нумары насценгазеты прызыўнага пункта: «...былі выпадкі, калі прызыўнікі стараліся ўтаіць свае фізічныя недахопы, баючыся, што яны з-за іх не трапяць у рады Чырвонай Арміі».

* * *

Увечары таго-ж дня, калі прызыўная камісія закончыла сваю работу, будучыя байцы сабраліся ў зале клуба шарсцянікаў. З увагай выслухалі будучыя лётчыкі, танкісты, маракі, пехацінцы даклад ваенкома тав. Самахвалава аб міжнародным становішчы. Затым выступілі з успамінамі аб баях на фінскім фронце ўдзельнікі гэтых баёў, ордэнаносцы старшы лейтэнант тав. Сцепанаў і палітрук тав. Бердычэнка.

У заключэнне вечара адбыўся канцэрт.

* * *

Першая група прызыўнікоў днямі адправілася ў свае часці. Перад выездам маладыя байцы сабраліся ў памяшканні прызыўной камісіі. На адбыўшымся мітынгу выступілі загадчык ваенным аддзелам гаркома партыі тав. Гудзееў, прадстаўнік горвыканкома тав. Волкаў і намеснік старшыні абкома профсаюза шарсцянікаў тав. Пырко. У сваіх прамовах яны віталі маладых байцоў і заклікалі іх падтрымліваць сувязь з прадпрыемствамі і ўстановамі, дзе да гэтага часу яны працавалі.

Бацька маладога прызыўніка, урач тав. Каган заявіў, што ён з радасцю адпраўляе свайго сына ў Чырвоную Армію, адзіную армію ў свеце, якая нясе шчасце чалавецтву.

* * *

На радзе беластоцкіх прадпрыемстваў адбыліся вечары, прысвечаныя провадам прызыўнікоў.

З 4-га камбіната ў армію ідзе 16 чалавек. Сярод іх комсамольцы, стаханаўцы. На развітальным вечары, арганізаваным калектывам рабочых камбіната пасля даклада аб міжнародным становішчы намесніка дырэктара камбіната тав. Сітава, выступіў стары рабочы-сукнавал тав. Іван Грык. Яго сын Нікалай, які працуе ў ахове камбіната, ідзе ў армію. Стары падзяліўся з прысутнымі ўспамінамі аб сваёй цяжкай службе ў ненавіснай царскай арміі і запэўніў, што яго сын будзе верна служыць совецкаму народу ў радах доблеснай Чырвонай Арміі.

Маладым байцам разданы падарункі. У выключна радасным, святочным настроі закончыўся развітальны вечар.

В. Бемаў.

Рост добрабыту працоўных

Рост добрабыту працоўных Граеўскага раёна можна наглядна прасачыць на павелічэнні пакупной здольнасці. За прайшоўшыя тры месяцы праз сельскую кааперацыю раёна прадана прамысловых тавараў на 3 мільёны 200 тысяч рублёў. Гэта на 500 тысяч рублёў больш, чым было прадана ў другім квартале 1940 года.

У параўнанні з кастрычнікам мінулага года пакупная здольнасць насельніцтва павялічылася больш чым у два разы.

Год натхнёнай працы мастакоў Беластока

Год жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі прынёс багатыя плады беластоцкім мастакам і скульптарам, якія атрымалі найшырэйшыя творчыя магчымасці і натхнёна працавалі над творамі, вартымі сваёй новай радзімы. У Беластоку створан Дом мастака, пад творчую майстэрню адпушчан вялікі светлы будынак, арганізавана студыя выяўленчага мастацтва, у якой мастакі атрымліваюць штодзённую кансультацыю і творчую дапамогу.

Падрыхтоўка да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» выклікала вялікі творчы ўздым. Сярод мастакоў разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за стварэнне лепшых твораў. Дзяржава аказала значную матэрыяльную дапамогу мастакам, выдаўшы ім авансам 150 тысяч рублёў. У падрыхтоўцы да выстаўкі ўдзельнічалі ўсе мастакі Беластока і вобласці.

Вялікую творчую дапамогу ў рабоце аказалі мінскія таварышы. Брыгада мастакоў у саставе тт. Рубінштэйна, Пашкевіча і Зайцава ў працэсе работы праглядзела эскізы і праекты, зрабіла рад заўваг і ўказанняў.

Велізарная работа па падрыхтоўцы да выстаўкі закончана. Днямі адбыўся адбор работ на выстаўку, у якім прынялі актыўны ўдзел усе мастакі Беластока. Разгарнулася цікавая дыскусія аб творчым метадзе, аб соцыялістычным мастацтве.

Скульптар С. Л. Месер на працягу пяці месяцаў працаваў над скульптурай «Сталін». Зараз работа закончана. Скульптура пасылаецца ў Мінск на выстаўку. Тав. Месер падрыхтаваў таксама праект скульптуры «Таварыш Сталін на трыбуне». Па думцы спецыялістаў, скульптуры тав. Месера прадстаўляюць вялікую мастацкую каштоўнасць.

Паспяхова працуе над праектам помніка «Вызваленне» для горада Беластока і помніка Чайкоўскаму для горада Масквы беластоцкі скульптар тав. Рапапорт, для якога абсталявана творчая майстэрня ў Мінску.

Малады беластоцкі скульптар тав. Ляўфер падрыхтаваў для выстаўкі скульптуру «Дзіця».

Графікі тт. Кшычаноўскі і Ляндаў падрыхтавалі сем высока мастацкіх работ, якія знаходзяцца зараз у Львове і адтуль будуць адпраўлены на выстаўку.

Самым багатым з'яўляецца аддзел жывапісу. Тут прадстаўлены разнастайнейшыя работы. Асабліва вылучаюцца вялікія карціны «Арышт памешчыка і паліцыянта»—тав. Краеўската, «Сустрэча казакаў у Беластоку» — Бернарда Ральніцкага, «Суд над памешчыкам»—тав. Малярэвіч.

Браты Сітрыны прадставілі на выстаўку восем акварэльных эцюдаў на калгасную тэматыку. З 10 пейзажаў тав. Капланскага асабліва вылучаецца «Гродненскі пейзаж». Браты Зайдэнбойтэн падрыхтавалі рад цікавых кампазіцый: «Работа калгаснікаў у полі», «Гутарка байца з калгаснікамі» і некалькі пейзажаў. Заслугоўваюць увагі тэматычныя карціны «Сустрэча часцей Чырвонай Арміі ў Беластоку»—тав. Мандэльцвайга і «Народ раззбройвае паліцэйскіх і афіцэраў»—тав. Фрыдмана. Мастак А. М. Берман закончыў цікавую карціну «Кветкі». Рад работ на выстаўку прадставілі мастакі тт. Цэнтнершвер, Берэнцвайг, Гельман, Розеншайн, Бабоўскі, Гутэрман і іншыя.

У Беластоку расце здольная моладзь. На выстаўку адпраўлена 7 работ 19-гадовага Бено Ральніцкага, якія сведчаць аб бясспрэчнай таленавітасці маладога мастака. Рад цікавых твораў прадставілі прызыўнікі тт. Рапапорт і Барэнштэйн.

110 лепшых мастацкіх работ 30 аўтараў Беластока адабраны на выстаўку «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці». 15 кастрычніка работы адпраўлены ў Мінск.

Т. Лясовіч.

Сустрэча народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа з студэнтамі педінстытута

14 кастрычніка народныя паэты БССР акадэмікі-ордэнаносцы Янка Купала і Якуб Колас наведалі Беластоцкі педінстытут. У 9 гадзін вечара ў актавай зале інстытута адбылася сустрэча народных паэтаў з студэнтамі і выкладчыкамі.

Студэнты горача сустрэлі старэйшых прадстаўнікоў беларускай літаратуры і прападнеслі ім букеты кветак.

Дырэктар інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР, кандыдат філалагічных навук тав. Барысенка расказаў калектыву педінстытута аб літаратурнай творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа.

З чыткай сваіх твораў выступілі абодва паэты. Янка Купала прачытаў вершы «Калыханка», «З новай думкай», «Наша моладзь», «Час быў тады», Якуб Колас—«Вольнаму народу», «Шчаслівым жанчынам», «На новай зямлі», «Радасная сустрэча».

Літгуртковец студэнт інстытута тав. Петрушэвіч на вечары чытаў свае вершы. Студэнт тав. Лашэвіч прачытаў вершы народных паэтаў.

Н. Дзейкун.

У БЕЛАСТОЦКАЙ ПРАМЫСЛОВАЙ СТРАХАВОЙ КАСЕ

Беластоцкая прамысловая страхавая каса аб'ядноўвае 160 арцелей нашай вобласці. Пры ёй працуе 186 грамадскіх інспектараў па ахове працы. За летні перыяд у дамах адпачынку пабываў 401 чалавек, у санаторыях і на курортах адпачывалі 33 чалавекі, у піонерскіх лагерах правялі лета 56 дзяцей і ў дзіцячых санаторыях—19 дзяцей. Пры касе існуе тры дзіцячых сады (у Беластоку, Ваўкавыску і Гродне). У бліжэйшы час дзіцячыя яслі адкрыюцца ў Беластоку і дзіцячы сад у Ломжы.

Нам. адказнага рэдактара Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

УБ — 72.

Друкарня Беластокдрук.